*Л.У.Ляховіч, дацэнт*

# ПРАБЛЕМА ГІСТАРЫЧНАГА ФАКТА І ЯГО ІНТЭРПРЭТАЦЫІ Ў ВЫХАВАЎЧЫМ ПРАЦЭСЕ

У сістэме выкладання сучаснай вышэйшай школы велізарнае значэнне надаецца прадметам гуманітарнага цыкла, у тым ліку сусветнай і айчыннай гісторыі. Студэнт павінен не толькі засвоіць пэўную колькасць вучэбнага матэрыялу, але і свядома арыентавацца ў падзеях і працэсах мінулага і сучаснага, аналізаваць і ацэньваць бягучую сацыяльна-палітычную інфармацыю.

Вядома, што светапогляд асобы ў пэўнай ступені залежыць ад пазнання і фарміруецца ім. Само пазнанне выступае як вельмі складаны, шматступенны, разнастайны па формах працэс прадметнага і духоўнага засваення чалавекам свету. Пры гэтым базавую ролю выконвае эмпірычнае пазнанне, мэта якога – устанаўленне фактаў. Факт навукі выступае як цэнтральны ў пазнанні, таму праблема атрымання, даследавання і інтэрпрэтацыі факта заўсёды надзвычай актуальная.

У палітычным жыцці, барацьбе ідэй і канцэпцый факты займаюць цэнтральнае месца. Гэта яскрава прасочваецца ў назвах рубрык перыядычнага друку: «Аргументы і факты», «Факты і падзеі», «Факты і каментарыі», «Разважанні над фактам», «Толькі факты», «Post factum» і інш. Пры гэтым размова ідзе не столькі аб змесце рубрык, колькі аб выкарыстанні фактаў для абгрунтавання пэўных ідэй і канцэпцый. Названая акалічнасць робіць праблему факта яшчэ больш актуальнай, шматграннай і значнай [1].

Ва ўсходнеславянскіх мовах слова «факт» стала выкарыстоўвацца з XVII ст. Можна адзначыць некалькі значэнняў гэтага паняцця. Па-першае, гэта сінонім паняццяў «ісціна», «з'ява», «вынік», штосьці рэальнае, канкрэтнае, адзінкавае.

Па-другое, з'ява , якая фіксуе эмпірычныя веды; у гэтым сэнсе факт супрацьстаіць тэорыі і гіпотэзе [2]. Навуковы факт, атрыманы ў выніку спецыяльна арганізаванай дзейнасці, апасродкаваны сістэмай, даказаны як сапраўды існуючы, адлюстроўвае пэўны бок рэчаіснасці. Факт ёсць тое, што існуе ў рэчаіснасці і рэальна пазнана. Асаблівасцю фактычных ведаў з'яўляецца іх статус эмпірычнай сапраўднасці. Сапраўднасць фактаў устанаўліваецца непасрэдна ў працэсе назірання і эксперыменту. Характарыстыкамі факта з'яўляюцца яго невычарпальнасць, адноснасць, фрагментарнасць, дэтэрмінаванасць, дыскрэтнасць, парадаксальнасць і інш.

Аднак згаданыя характарыстыкі факта, цалкам сапраўдныя для прыродазнаўчых і матэматычных навук, дэфармуюцца ці нават страчваюцца ў гуманітарных навуках, і гісторыя ў гэтым сэнсе – не выключэнне.

Па гісторыі і грамадазнаўстве напісаны тысячы кніг, распрацаваны сотні кірункаў і канцэпцый, а колькасць пытанняў і дыскусійных тэм не змяншаецца. Сапраўды, нашто патрэбна гісторыя, калі чалавецтва не робіць ніякіх высноў з яе ўрокаў? Як растлумачыць гістарычны працэс? Як разабрацца, калі тлумачаць па-рознаму? Што рабіць з гістарычнымі крыніцамі – часта суб'ектыўнымі, перапісанымі з чужых слоў, са скажэннямі і недакладнасцямі? Таму і існуюць міфы, тэндэнцыёзныя трактоўкі, сумніўныя ісціны і інш. У гісторыі значна больш невядомага, парадаксальнага і заблытанага, чым падаецца на першы погляд. У гэтым сэнсе гісторыя – самая неканкрэтная навука, і знак пытання тут больш дарэчы, чым у любой іншай галіне ведаў [3]. А ўсё ўпіраецца ў фундаментальную па сваёй прастаце і складанасці рэч – гістарычны або сацыяльны факт.

У грамадазнаўчых навуках не выпрацавана пакуль асобая, фармалізаваная мова для выражэння тэарэтычных мадэлей, якая дазваляла б з дакладнасцю матэматычных ці прыродазнаўчых дысцыплін разглядаць працэсы сацыяльнай рэчаіс-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насці. Таму тлумачэнне сацыяльных з'яў і фарміраванне фактаў ажыццяўляюцца шляхам інтэрпрэтацыі даных на аснове агульных тэарэтычных уяўленняў аб сацыяльнай рэчаіснасці ў выглядзе філасофіі гісторыі, а таксама сацыяльна-палітычных і ідэалагічных тэорый[4].

Адсюль – першая складанасць у інтэрпрэтацыі гістарычных фактаў. Гэта прывязанасць сацыяльнага факта да канкрэтных гістарычных і ідэалагічных установак, што прама ўплывае на агульную навуковую карціну. У сацыяльным факце заўсёды адлюстроўваюцца не толькі прырода вывучаемай з'явы, але і інтэлектуальны ўзровень, сацыяльная пазіцыя і асабісты інтарэс самога даследчыка. Здавалася б, патрэбна імкнуцца да максімальнай аб'ектыўнасці – апісваць «усё, як ёсць». Аднак гэта – не больш, чым ілюзія. Чыстая эмпірычнасць у сацыяльным пазнанні нерэальная хаця б таму, што, назіраючы адно і тое ж, розныя людзі дадуць гэтаму розную трактоўку і ацэнку. Тым больш, што эксперыментальна ці статыстычна праверыць або паўтарыць сацыяльны факт немагчыма. У гістарыяграфіі ўжо быў метад нямецкага вучонага Ранке – пісаць гісторыю «так, як было на самай справе», аднак засцерагчыся ад суб'ектывізму нельга. Акрамя таго, апісваючы адны бачныя з'явы, можна атрымаць толькі хроніку і апісальніцтва, той зародкавы стан гісторыі, з якога яна ўжо выйшла. Гістарычная ж навука заклікана не толькі апісваць, але і пазнаваць глыбінную сутнасць працэсаў, разумець іх з пункту існуючага сацыяльнага ідэалу, рабіць пэўныя прагнозы. Больш таго, аб гісторыі можна весці гаворку па крайняй меры ў трох аспектах: 1) як аб рэальных падзеях; 2) як аб слядах гэтых падзей; 3) як аб ведах, атрыманых шляхам вывучэння гэтых «слядоў». Прычым вельмі важна не змешваць гэтыя тры пазіцыі. Гісторыя – гэта тое, што было, а не тое, як аб гэтым пішуць. У процілеглым выпадку адкрыты шлях для легендаў і фальсіфікацый, міфаў і маралізатарства, у выніку атрымоўваецца «наіўны гістарызм».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праблема гістарычнага факта мае яшчэ адзін, вельмі складаны аспект. Гаворка ідзе аб гістарычных крыніцах, тым грунце і фоне, на якіх будуюцца факты і тэорыі. Гісторык мае справу з тым, што засталося. Ці шмат чаго захавалася на працягу стагоддзяў, падчас войн, пажараў, мэтанакіраванага знішчэння? Засталося мала, аднак не гэта галоўнае. Галоўнае – наколькі можна верыць таму, што засталося.

Крыніцы могуць быць вынікам селекцыі. Самы просты прыклад – зняцце «непажаданых» дакументаў з архіваў ці іх знішчэнне. Некаторыя крыніцы з грыфам «сакрэтна» ўвогуле не пападуць у рукі даследчыка. Да таго ж далёка не ўсе працэсы і падзеі адлюстроўваюцца ў пісьмовых крыніцах. Акрамя таго, дакумент можа быць фальсіфікаваны, свядома зменены па меркаваннях асобных ці карпаратыўных інтарэсаў, бяспекі ці ідэйных памкненняў. Асобная гаворка – недакладнасці, лакуны, розначытанні. Гістарычныя асобы могуць мець некалькі імён і звацца па-рознаму ў розных дакументах, адна і тая ж падзея можа выступаць пад рознымі датамі і інш. Пры шматразовым перапісванні і спасылках недакладнасці могуць наслойвацца, ствараючы далёкую ад рэальнасці карціну. Бывае, што інфармацыю пакідае канкрэтны чалавек са сваімі сімпатыямі і інтарэсамі. Нарэшце, сама гістарычная крыніца можа быць беспадстаўнай, з элементамі казачнасці, фантастыкі (накшталт нататкаў аб вандроўках Марка Пола). Ці можна, шчыра кажучы, лічыць сапраўднымі гістарычнымі крыніцамі «Іліяду» і Адысею»? А «Аповесць мінулых часоў», якая выклікала сумненні яшчэ у М. В. Ламаносава? Гэты пералік можна працягваць і далей.

Сацыяльны факт шматслойны: на дзеянне індывідуума накладваецца ўздзеянне розных узроўняў сацыяльнай арганізацыі – ад яго блізкіх да дзяржавы.

Галоўная прычына складанасці паняцця «гістарычны факт» заключаецца ў складанасці яго ўнутранай структуры, шматступеннасці і этапнасці яго фарміравання. Аднак пры ўсёй

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

складанасці праблематыкі факт заклікаты выступаць у сваёй вядучай ролі – «кванта» сацыяльна-гістарычнай інфармацыі і рэканструктара аб'ектыўнай ісціны ў гісторыі [5].

Падводзячы вынік, патрэбна сказаць, што, нягледзячы на наяўныя тэарэтычныя распрацоўкі, праблема гістарычнага факта і яго інтэрпрэтацыі далёка не вычарпана. Ускладняецца сацыяльная рэальнасць, у сучаснай навуцы выпрацоўваюцца новыя падыходы і карціны свету на аснове інтэграцыі і сістэматызацыі навуковых ведаў. Праблема сацыяльнага факта вельмі цесна звязана з элементамі калектыўнай і індывідуальнай псіхалогіі, а таксама з феноменам масавай свядомасці. У кантэксце адзначанага надзвычай важна мець на ўвазе асаблівасці сацыяльнага факта і ў працэсе выкладання гістарычных дысцыплін.

---


1. *Мерзон Л.С.* Проблемы научного факта. –Л.: Изд-во Ленинградского ун-та, 1972. – С. 3,6.

2. *Вадзінскі Д.І.* Навуковы факт у педагагічным даследаванні // Весці Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. – 1996. – № 3. – С.9.

3. *Бушков А.А.* Россия, которой не было: загадки, версии, гипотезы.– М.: ОЛМА-ПРЕСС; СПб.: «Нева»; Красноярск: «Бонус», 1997. –С. 45–46.

4. *Будко В.В.* Адекватность научного познания. – Харьков: Университетское, 1990. – С. 80–81.

5. *Лисовина А.П.* Категория «исторический факт» в марксистской и буржуазной историографии. – Кишинев: Кишиневский ун-т, 1981. – С.10.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ